*Салаўёва Н.У., выкладчыца кафедры міжмоўнай і міжкультурнай камунікацыі*

# ГЕНДЭРНЫ АСПЕКТ НЕВЕРБАЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

Дыферэнцыяцыя камунікантаў паводле полавай прыкметы дапускае наяўнасць пэўнай мадэлі паводзін. Сацыяльныя мадэлі, сфармаваныя на ранняй стадыі жыццёвага развіцця, на працягу полаўзроставага развіцця індывідаў-камунікантаў умацоўваюцца.

Мэта нашай працы – удакладніць спецыфіку ўзаемадзеянняў полавай прыналежнасці камуніканта і сродкаў невербальных зносін, якія ён выкарыстоўвае. Так, Д. Пірсан канстатуе, што камунікацыя звязана з полам прамоўцы з прычыны таго, што яна ідэнтыфікуе, стымулюе альбо стрымлівае інтэрналізацыю схільнасцяў, звязаных з жаночай ці мужчынскай тыпалогіяй. Вышэйазначанае палажэнне пацвярджаецца таксама існаваннем спецыфічных невербальных і вербальных узораў, моў жаночай і мужчынскай субкультур [1].

Праведзеная серыя эксперыментальных даследаванняў паказвае на спецыфіку гэндэрнага аспекту выказвання невербальных камунікатыўных сігналаў. Да найбольш эксплiцытна распаўсюджаных адносіцца ўсмешка, і жанчыны-камуніканты праяўляюць тэндэнцыю да больш частага яе выкарыстання. Гэта пацвярджаецца вынікамі эксперыменту, праведзенага Д. Хавіландам. У межах дадзенага эксперыменту даследчая задача вызначалася як ідэнтыфікацыя полу немаўлят паводле іх фотаздымкаў. Больш пазытыўны выраз твару суадносіўся з жаночым тыпам камунікатыўнай экспрэсіі, больш негатыўны эмацыйны «партрэт» твара атаясамляўся з мужчынскім варыянтам камунікатыўнага выразу [2]. Далейшыя даследаванні групы вучоных пад кіраўніцтвам Д. Бургуна прадставілі матывацыю выкарыстання невербальнага сродка «ўсмешка»: у межах жаночага тыпу камунікацыі ў мэтах устанаўлення ўзаемадзеяння з суразмоўцамі, у межах мужчынскага варыянта зносін – для выразу станоўчых эмоцый, у стане шчасця, задавальнення, прыемнасці і г. д. [3]

У адпаведнасці з даследаваннем М. Аргайла, Х. Розенфельда функцыянальная сутнасць усмешкі ў жаночым камунікатыўным выкарыстанні адлюстроўвае шчасце, прывітанне, спакой, ухвалу. Пры гэтым два апошнія паказчыкі з'яўляюцца найбольш частотнымі [4, 5].

Большае распаўсюджанне ўсмешкі ў выразе твару жанчын (у параўнанні з мужчынамі) абумоўлена іх сацыяльнай слабасцю і непераадольным жаданнем атрымаць ухвалу ў дамінуючага мужчынс-

кага полу, з аднаго боку, і падкрэсліць уласную бязвіннасць альбо ўдала «замаскіраваць» сацыяльную негрунтоўнасць, з другога боку.

Уяўляюць цікавасць даследванні кагнітыўных працэсаў у аспекце гендернай камунікацыі. Так, жанчыны, якія не пасміхаюцца, успрымаюцца значна больш жорстка, чым сур'ёзныя мужчыны. Змястоўныя параметры кагнітыўнага боку гэтага працэсу заключаюцца ў тым, што камунікантьі-жанчыны, не выкарыстоўваючы усмешкі, успрымаюцца як менш шчаслівыя, менш релаксаваныя, чым камунікантьі-мужчыны з ідэнтычнай экспрэсіяй твару.

Другая характэрная рыса жаночага тыпу камунікацыі – больш інтэнсіўная часціня візуальнага кантакту. Адзначана, што камунікантьі-жанчыны, у адрозненне ад камунікантаў-мужчын, падтрымліваюць больш інтэнсіўны візуальны кантакт. Пры гэтым пол суразмоўцы не ўплывае на тое, як часта жанчына дэманструе дадзены невербальны сігнал.

Неабходна адзначыць той факт, што ў межах камунікатыўнага монапалавога («жанчына-жанчына») працэсу назіраецца больш інтэнсіўная ступень актуалізацыі візуальнага кантакту ў параўнанні з камунікацыяй «мужчына-мужчына». Пазітыўны эмацыйны зарад камунікацыі спрыяе найбольш частаму праяўленню візуальнага кантакту ў камунікацыі першага тыпу і паніжэнню ўзроўню яе распаўсюджанасці ў камунікацыі другога тыпу. Тоесная тэндэнцыя назіраецца ў камунікатыўным дыпалавым працэсе («жанчына-мужчына»).

Магчыма, адна з прычын высокай ступені рэалізацыі візуальнага кантакту ў невербальным комплексе жанчын – іх здольнасць да якаснага дэкадзіравання паралінгвістычных аспектаў камунікацыі. Другая прычына звязана з ролевымі гендэрнымі пазіцыямі ўдзельнікаў камунікатыўнага працэсу: суразмоўцы жаночага полу асацыіруюцца ў большай ступені са слухачамі, у той час як суразмоўцы мужчынскага полу – з апавядальнікамі. У сваю чаргу, псіхалагічныя назіранні паказваюць, што слухач праяўляе тэндэнцыю да больш працяглага і інтэнсіўнага ўстанаўлення візуальнага кантакту, чым апавядальнік. Адсутнасць гэтага невербальнага параметра ў жаночай субкультуры ўспрымаецца як індыкатар няўважлівасці ці адсутнасці зацікаўленасці [6].

Наступная тыпалагічная адзнака жаночага тыпу камунікацыі – менш выяўленая «прэтэнзія» на прасторавую патрабавальнасць суадносна з памерамі ўласнага цела. Метады прамога назірання дазволілі высветліць гендэрную спецыфіку ў межах уласнай і сацыяльнай тэрытарыяльнай прасторы камунікацыі. Так, тэрытарыяльная прастора паміж камунікантам-мужчынам у сядзячай паставе і спінкай крэсла большая ў параўнанні з такой у працэсе камунікацыі субяседнікаў-жанчын. Магчыма, гэта адзін з шляхоў дэманстрацыі пачуцця

уладара і ўласніка. Незалежна ад паставы «сядзець» ці «стаяць» камунікaнты жаночага полу размяшчаюць ногі такім чынам, каб тэрытарыяльная прастора, якую яны займаюць, была найменшай.

Найбольшая камунікатыўная дыстанцыя зафіксавана на працягу зносін паміж суразмоўцамі-мужчынамі высокага сацыяльнага статусу. Патынцыйныя камунікaнты-жанчыны, якія рухаюцца, – набліжаючыся да жанчыны ці мужчыны з мэтай устанаўлення камунікатыўнага кантакту – дазваляюць максімальна паменшыць дыстанцыю. Ідэнтычныя сітуацыі, ініцыяваныя мужчынамі, садзейнічаюць захаванню дыстанцыі. Адно з гіпатэтычных тлумачэнняў падобнай спецыфікі камунікатыўных актаў звязана з сацыяльна-культурнай роляй жанчыны (залежнасць, пасіўнасць).

Вельмі цікавым уяўляецца факт, які звязвае акрэсленую тэрытарыяльную пазіцыю камунікaнта-мужчыны з яго сацыяльнай роляй кіраўніка. Аднак тоесная прасторавая камунікатыўная пазіцыя суразмоўцаў-жанчын не асацыіруецца з іх падобнай грамадскай роляй. Гэта адзін з вынікаў сацыяльна-камунікатыўных выразаў гендэрнай паралінгвістыкі.

Спектр, які ўключае рухі цела і жэсты з удзелам галавы (не твару), рук, ног, невербальнай камунікацыі, адлюстроўвае каларыт гендэрнай спецыфікі. Так, рухі рук, з'яўляючыся важным кампанентам самапрэзэнтацыі камунікaнта, маюць варыянты ў тэхніцы выкарыстання ў залежнасці ад яго полу. Жанчыны здзяйсняюць грацыёзныя рухі рукі ад локця, у той час як рухі рук камунікантаў-мужчын носяць больш дакладны характар і робяцца ад пляча.

Варта падкрэсліць спецыфічнасць гендэрнага аспекту ўспрыняцця невербальных знакаў камунікацыі. Напрыклад, камунікaнты-жанчыны больш давяраюць візуальнаму кантакту. Гэта, у сваю чаргу, можна разтлумачыць імкненнем да ўлоўлівання максімальнай колькасці сэнсавых пасланняў ад партнёра па камунікацыі з мэтай ажыццяўлення чалавечых і прафесійна-дзелавых кантактаў.

Такім чынам, невербальны комплекс камунікацыі паводзін жанчын суадносіцца з грамадскімі стэрэатыпамі іх успрыняцця. Іх тэрытарыяльныя паводзіны спалучаюцца з грамадскім стэрэатыпам пакорлівасці і ўтаймавання, а іх камунікатыўныя рухі накіраваны на ажыццяўленне экспрэсіўнасці.

Аналіз гендэрнай невербальнай камунікацыі мужчынскага тыпу паказвае, што іх комплекс паводзін асацыіруецца з адпаведнымі ім сацыяльным статусам альбо грамадскай уладай.

Немалаважны аспект інтэрпрэтацыі гендэрнай невербальнай камунікацыі – ступень карэктнасці яе ўспрыняцця асобамі жаночага і мужчынскага полу. Шматлікія даследаванні (Д. Ліберман, Т. Рыга, Р. Кампайн, Д. Холл, Н. Роттер, Г. Роттер) дэманструюць вялікую

ступень дакладнасці ўспрыняцця аналізуемых камунікатыўных сігналаў з боку камунікантаў-жанчын [6].

Шэраг эксперыментальных даследаванняў (Х. Вагнер, Р. Бак, Д. Вінтэрботэм) дазваляе канстатаваць, што інтэрпрэтацыя эмацыйных настрояў суб'ектаў па каляровых фотаздымках ажыццяўляецца жанчынамі больш карэктна. Мужчыны менш дакладна ідэнтыфікавалі невербальныя функцыі эмоцый, пры гэтым больш дакладна выяўлялі яго спецыфіку пры аналізе мужчынскага комплексу пачуцця.

Некаторыя нашы даследаванні паказваюць, што паддоследныя жанчыны значна больш дакладна дэманструюць сігналы экспрэсіі твару ў параўнанні з удзельнікамі эксперыменту – мужчынамі.

Адна з тэорый па ўстанаўленню вышэйакрэсленых фактаў звязана з падпарадкаваным сацыяльным статусам жанчын. Другая тэорыя тлумачыць гэтую тэндэнцыю імкненнем камунікантаў жаночага полу да супрацоўніцтва з сваім атачэннем. У сапраўднасці, дастаткова цяжка дыферэнцыраваць сувязь падначальвання і супрацоўніцтва, асабліва ў прафесійна-дзелавым кантэксце.

**Літаратура:**

1.Pearson J.C. Interrelationships between Gender and Communication // Monograph, 1997. - Vol. 2, № 8. -P. 26-38.

2.Haviland J.M. Sex-related Pragmatics in Infants' Nonverbal Communication // Journal of Communication, 1987. - Vol. 27, № 2. - P. 80-84.

3.Burgoon J.K., Buller D.B., Woodall W.G. Nonverbal communication. The Unspoken Dialogue. – New York: Harper Collins, 1999.

4.Argyle M.K. The Psychology of Interpersonal Behavior. - Harmondsworth: Penguin, 1967.

5.Rosenfeld H.M. Instrumental Affiliative Functions of Facial and Gestural Expressions // Journal of Personality and Social Psychology, 1996. - Vol. 1, № 4. - P. 65-72.

6 Lieberman D.A., Rigo T.G., Campain R.F. Age-related Differences in Nonverbal Decoding Ability // Communications Quarterly, 1998. - Vol. 36, № 4. - P. 290-297.